# ЗМЕНЫ Ў ГЕНЕРАЛЬНЫМ ПЛАНЕ І ГАСПАДАРЧА-КАМУНАЛЬНАЙ ІНФРАСТРУКТУРЫ г. МІНСКА (1945–1965)

**А. В. Курдо**

*Беларускі дзяржаўны універсітэт, Мінск;*
*anton.kurdo@gmail.com;*
*навук. кір. – П. І. Брыгадзін, д-р гіст. навук, праф.*

У рамках дадзенага даследавання паказаны змены плана, і інфраструктуры гарадскога асяроддзя Мінска, некаторыя праблемныя пытанні і як яны вырашаліся ў выніку, на чым былі зроблены акцэнты пры аднаўленні і новым будаўніцтве Мінска ў першае пасляваеннае дваццацігоддзе.

***Ключавыя словы:*** горадабудаўніцтва Мінска; жыллёвая палітыка; генеральны план; інфраструктура.

Перыяд 1945-1965 гг. – гэта дваццацігоддзе магчымасцяў і інтэнсіўнага росту для Мінска. У гэты час адбываўся перагляд і мадэрнізацыя многіх горадабудаўнічых прынцыпаў і парадыгмаў.

Маштабныя разбурэнні Мінска падчас вайны паставілі пытанне аб мэтазгоднасці аднаўленчых работ. Гучалі прапановы аб будаўніцтве новага горада ў некалькіх кіламетрах ад руін старога, разбуранага Мінска. У выніку перамог пункт гледжання аб адраджэнні сталіцы на яе ранейшым месцы. З гэтай мэтай была створана новая структура - трэст па разборцы разбураных будынкаў і аднаўленню будаўнічых матэрыялаў. У выніку прынятых кіраўніцкіх рашэнняў, пачаліся актыўныя аднаўленчыя работы. Аднымі з найбольш характэрных для таго перыяду тыпу мерапрыемстваў, накіраваных на аднаўленне гарадскога асяроддзя, сталі масавыя заклiканнi мясцовага насельнiцтва для ажыцяўлення аднаўленчых работ, т.з. суботнікі (нядзельнік). Такiм чынам, 8 кастрычнiка 1944 г. у горадзе прайшоў першы масавы нядзельнiк. Кожны з гарадскiх раёнаў - Сталiнскi, Варашылаўскi i Кагановiцкi - быў разбiты на 10 вытворчых участкаў. У горадзе было створана дзевяць складскiх пунктаў для захоўвання сабранага металу i будматэрыялаў. Усяго ў нядзельнiку прынялi ўдзел 33 тысячы мiнчан. За гэты дзень было разабрана, ачышчана i выкладзена ў штабелi 1.316.000 цаглiн. Сабрана 1.065 тон розных будаўнiчых матэрыялаў, нарыхтавана 2.050 кубаметраў друзу. Было разабрана i выкладзена ў штабелi 403 кубаметры бутавага каменя. Ачысцiлi ад завалаў i смецця 15.500 кв. метраў плошчы, засыпалi 2.500 кубаметраў варонак. Пазней суботнікі і нядзельнік арганізоўваліся рэгулярна [1, с. 124–127]. Такім чынам мінчане ўносілі свой уклад у адраджэнне сталіцы.

У выніку правядзення першасных аднаўленчых работ, такіх як разбор завалаў і разбураных будынкаў, ўборка смецця, збор матэрыялаў, прыдатных для далейшага выкарыстання, стала магчымым больш дэталёвае абмеркаванне далейшых планаў аднаўлення і будаўніцтва Мінска. Аднак падрыхтоўку да новага будаўніцтва кіраўніцтва краіны пачало весці загадзя. Так, рашэннем савецкага ўрада ў 1943 г. было створана Упраўленне па справах архітэктуры пры СНК БССР [1, с. 134], закліканае кіраваць і кантраляваць праектаванне, аднаўленне і рэканструкцыю гарадоў і вёсак.

Такім чынам, першы пасляваенны генеральны план Мінска быў складзены «Белдзяржпраектам» у канцы 1945 г. (архітэктары - Н. Трахтэнберг і М. Андросаў, інжынеры - К. Іваноў, В.Талмачоў і Р. Абразцова, кансультанты - праф. В.Семенаў і Н. Палякоў). Генплану папярэднічала складанне ў 1944 г. «Эскіза планіроўкі Мінска», у аспрацоўцы якога прымалі ўдзел архітэктары А.Шусеў, А.Мардвіноў, Н.Коллі, В.Семенаў, Б.Рубаненка, І.Лангбард, Н.Трахтенберг. Пасля некаторай карэкціроўкі генплан быў зацверджаны ў сярэдзіне 1946 г. [8, с. 27].

Па генеральным плане тэрыторыя Мінска ў межах гарадской рысы, якая складала 7,7 тыс. га, пашыралася да 13 тыс. га, уключаючы рэзервовую плошчу для далейшага будаўніцтва прамысловых і камунальных устаноў. Пашырэнне тэрыторыі горада праводзілася ў асноўным у паўднёва-ўсходнім напрамку. Тут ствараўся новы раён, які вызначаў прамысловы твар горада. Па плане цэнтральную частку горада вырашылі забудоўваць ў асноўным 4-5-павярховымі дамамі (не больш чым 6-павярховымі). Зоны 2- і 3-павярховай забудовы - размяшчаць вакол цэнтральнай часткі горада. Цэнтр павінен быць забудаваны мануменальнымі дамамі, якія чаргуюцца з зялёнымі прасторамі, упрыгожанымі помнікамі, якія адлюстроўваюць гераічныя падзеі вайны, і іншымі мемарыяльнымі будынкамі. Савецкую вуліцу (цяпер пр. Незалежнасці) прапанавана было ў выніку рэканструкцыі ператварыць у галоўны праспект горада, з павышанай якасцю архітэктуры жылых і грамадзянскіх будынкаў, з самым перадавым добраўпарадкаваннем, надаўшы асаблівую ўвагу зялёнаму будаўніцтву [4, с. 35]. Цэнтр горада прапаноўвалася выбудаваць як адзіную сістэму плошчаў, якая ўключае ў тым ліку і плошчу Свабоды. Таксама ў цэнтр павінна ўваходзіць тэрыторыя кварталаў, размешчаных у раёне вуліц Леніна і Савецкай.

Трэба заўважыць, што з 1946 па 1965 год Генеральны план Менска быў адкарэктаваны двойчы. Праект плана быў выпраўлены з улікам новых абставін у комплексе гарадскіх фактараў: павелічэнні колькасці насельніцтва, больш эканомнага выкарыстання гарадской прасторы і інш. [9, с. 16-19].

Адной з самых надзённых праблем гарадскога аднаўлення і развіцця стала жыллёвае пытанне, вырашэнне якога мела высокі прыярытэт у параўнанні з многімі іншымі напрамкамі гарадскога будаўніцтва. Аднак вырашыць праблему ў адзін момант не ўяўлялася магчымым з-за яе маштабаў (у выніку ваенных дзеянняў жыллёвы фонд быў разбураны на 80%), такім чынам пытанне вырашалася паступова. Умоўна развіццё жыллёвага будаўніцтва Мінска першага пасляваеннага дваццацігоддзя можна падзяліць на тры этапы. На першым этапе (1945-1950 гг.), нароўні з аднаўленнем часткова ацалелых будынкаў, праводзілася шматпавярховая забудова і рэканструкцыя цэнтральнай часткі горада; напрыклад, паблізу трактарнага і аўтамабільнага заводаў (прыкладна ў 7 км ад цэнтра горада) ствараліся пасёлкі, па сутнасці ў той час загарадныя, з малапавярховымі тыповымі будынкамі. Новае будаўніцтва ў цэнтры вялося на расчышчаных ад руін пляцоўках, а на перыферыі горада - на свабодных тэрыторыях.

Другі этап развіцця жыллёвага будаўніцтва пачаўся ў 50-я гады. З цэнтра горада яно паступова ішло па кірунку асноўных гарадскіх магістраляў у бок прамысловых раёнаў. Пры забудове магістраляў у раёнах з будынкамі сядзібнага тыпу, якія захаваліся, праводзіліся мерапрыемствы па рэканструкцыі. Мясцовыя ўлады імкнуліся ліквідаваць адрозненне ў тыпах новых жылых дамоў; будаўніцтва малапавярховых будынкаў у завадскіх жылых раёнах было спынена і пачалося ўзвядзенне дамоў большай паверхавасці. Менавіта на гэтым этапе ў Мінску быў у асноўным сфарміраваны цэнтральны раён, які аказаў вялікі ўплыў на архітэктурна-мастацкае аблічча і на планіровачную структуру сталіцы ў цэлым.

Трэці этап у развіцці жыллёвага будаўніцтва (канец 50-х - пачатак 60-х гадоў) адзначыўся пераходам на масавае буйнаблочнае і буйнапанэльнае індустрыяльнае домабудаванне і стварэнне жылых мікрараёнаў на свабодных тэрыторыях. Ўзнікалі новыя значныя па памерах жылыя масівы.

У выніку праведзенай жыллёвай палітыкі пытанне недахопу жылля было з большага вырашана. Да пачатку 1966 г. жылая плошча ў горадзе павялічылася больш чым у 4 разы ў параўнанні з 1940 г. [5]. Павялічылася доля новых шматпавярховых, цалкам добраўпарадкаваных дамоў, што ў сваю чаргу дало магчымасць забяспечыць побыт вялікай колькасці мінчан. [3]

Поспехі ў стварэнні больш спрыяльных умоў жыцця жыхароў сталіцы і ў агульным аздараўленні горада ў шмат чым звязаны і з развіццём інжынернай гаспадаркі горада – цэнтралізаваных сістэм водазабеспячэння, каналізацыі і энергазабеспячэння.

Сістэма цэнтралізаванага гарадскога вадаправода, упершыню створаная ў Мінску ў сярэдзіне 20-х гг., сілкуецца з падземных крыніц, размешчаных у глыбокіх ваданосных гарызонтах. У гады вайны водазаборным збудаванням і асноўным вадаправодам быў нанесены вялікі ўрон. На канец 1965 года гарадскі вадаправод забяспечваў падачу спажыўцам вады, аб’ём якой больш чым у 7 разоў перавышаў аб'ём водаспажывання ў 1940 г. [2, с. 171]

У пасляваенныя гады былі рэканструяваны ўсе старыя і арганізаваны тры новых буйных водазаборных свідравін (глыбінёй 120–300 м.), размешчаных у прыгараднай зоне. Агульная працягласць водаразводячай сеткі павялічылася больш чым у 4 разы. Праведзеныя гідралагічныя даследаванні выявілі новыя магчымасці для пашырэння крыніц сістэмы гарадскога водазабеспячэння як з падземных ваданосных гарызонтаў, так і з адкрытых вадаёмаў. У выніку былі выяўлены крыніцы з вадой высокай якасці.

Буйныя працы былі ажыццёўлены ў пасляваенныя гады і ў сістэме гарадской гаспадарча-фекальнай каналізацыі, упершыню ўведзенай у эксплуатацыю ў Мінску ў 1930 г. Гэтая сістэма патрабавала не толькі аднаўлення, але рэканструкцыі і значнага развіцця ў адпаведнасці з новым маштабам забудовы горада. За перыяд 1944-1964 гг. працягласць каналізацыйнай сеткі павялічылася амаль у 7 разоў; яна ахапіла значную частку забудаванай гарадской тэрыторыі. У 1964 г. аб'екты першай чаргі будаўніцтва ачышчальных збудаванняў, размешчаных у прыгараднай зоне, ўступілі ў эксплуатацыю, а старыя перасталі функцыянаваць.

Пабудаваныя ў апошнія гады першага пасляваеннага дваццацігоддзя каналізацыйныя калектары дазвалялі асвоіць пад забудову новыя буйныя тэрыторыі ў адпаведнасці з генеральным планам развіцця Мінска. Па сутнасці, зноўку была пабудавана сетка калектараў ліўневай каналізацыі, выпускі з якой былі арганізаваны на р. Свіслач і яе прытоках. Найбольшае развіццё ў пасляваенныя гады атрымалі збудаванні і камунікацыі, якія забяспечваюць энергазабеспячэнне Мінска.

Сістэма цеплафікацыі горада створана пасля вайны. Да канца 1965 года яна ахапіла амаль усе новыя жылыя і прамысловыя раёны і вялікую частку старых раёнаў Мінска з капітальнай забудовай. Пабудавана буйная ЦЭЦ і значна пашырана даваенная ЦЭЦ. У жылых раёнах з капітальнай забудовай, размешчаных па-за зонай дзеяння ЦЭЦ, створана сетка раённых кацельняў. Да 1966 г. ад ЦЭЦ, раённых і групавых кацельнях цэнтралізаваным цеплазабеспячэннем ахоплена каля 60% кватэр горада [6]. Значна развіта сетка гарачага водазабеспячэння.

З 1957 года ў Мінску пачала стварацца сістэма газазабеспячэння спачатку на аснове звадкаванага газу, а некалькі пазней з выкарыстаннем прыроднага газу, які падаецца па газаправодзе высокага ціску з Дашаўскага газавага радовішча ў перадгор'е Карпат. У 1965 г. звадкаваным і прыродным газам у Мінску было забяспечана 115 тыс. кватэр [7], у тым ліку прыродным газам каля 90 тыс. кватэр [7], і многія прамысловыя прадпрыемствы. На газавае паліва перакладзеныя ўсе раённыя кацельні, адна ЦЭЦ і часткова другая. Шырокае выкарыстанне прыроднага газу дазволіла істотна змяніць паліўны баланс горада, знізіць забруджванне яго паветранага басейна і вызваліць транспарт ад залішніх перавозак дроў, торфу і паліва, якое трэба было прывозіць здалёк - каменнага вугалю і мазуту.

Мінск забяспечваўся электраэнергіяй ад Мінскай энергасістэмы, якая з'яўляецца часткай Беларускай энергасістэмы, якая сфармавалася ў пасляваенныя гады. Спажыванне электрычнай энергіі ў горадзе вельмі хутка павялічвалася. У 1965 годзе яно больш чым у 20 разоў перавысіла ўзровень яе спажывання ў 1940 г. У горадзе пабудаваны шэраг падстанцый «глыбока ўводу» электраліній 110 кв, 220 кв у цэнтры нагрузак, звязаных паміж сабой і з галоўнымі сілкавальнымі цэнтрамі. Усё шырэй выкарыстоўваюцца ў гарадской электрасетцы падземныя кабелі, што ў выніку дазваляла адмаўляцца ад паветраных высакавольтных ліній, якія замінаюць забудове.

Істотныя пераўтварэнні адбыліся ў гарадской тэлефоннай сетцы, а таксама ў сістэме асвятлення вуліц Мінска. Асветленасць вуліц павялічылася за пасляваенныя гады ў некалькі разоў. На многіх магістральных вуліцах на самастойных жалезабетонных апорах ўстаноўлены свяцільні з эканамічнымі люмінесцэнтнымі, ртутнымі і іншымі лямпамі. Арганізавана цэнтральнае дыспетчарскае кіраванне ўсёй сеткай вонкавага асвятлення з прыладамі, якія дазваляюць з цэнтральнага пункта ўсталёўваць, у якой частцы горада адбылося парушэнне асвятлення.

У заключэнне можна сказаць, што першае пасляваеннае дваццаціоддзе – гэта перыяд сур'ёзных горадабудаўнічых і архітэктурных зменаў Мінска, у які ў значнай меры было сфармавана сучаснае аблічча і структура горада. Таксама можна адзначыць гнуткае рэагаванне горадабудаўнікоў на інтэнсіўна зменлівую дэмаграфічную сітуацыю, што ў выніку прыводзіла да своечасовага перагляду генеральнага плана Мінска. Важным момантам у інфраструктурным будаўніцтве горада стаў той факт, што для паляпшэння побыту мінчан пры забудове жылых масіваў пачалі ўкараняцца новыя прагрэсіўныя формы арганізацыі бытавога абслугоўвання, некаторыя з якіх у сваю

чаргу не толькі палягчалі побыт, але і стваралі больш спрыяльную сераду з пункту гледжання гігіены і экалогіі горада.

**Бібліяграфічныя спасылкі:**


1. *Бон, Т.* «Мінскі феномен». Гарадское планаванне і ўрбанізацыя ў Савецкім Саюзе пасля 1945 г. / Томас М. Бон; пер. З ням. Мовы М.Рытановіч; навук. рэд. Г. Сагановіч. – Мінск; Выдавец Зміцер Колас, 2016. – 436 с.
2. *Воинов, А. П.* Минск. Послевоенный опыт реконструкции и развития. / А.П. Воінов - М., 1966.
3. Жилищное строительство – дело первостепенной важности // СБ. 6.6.1951. № 113.
4. *Лысенко А. В.* Главная улица Минска (Ленинский проспект). Минск, 1963.
5. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). – Ф. 4. Оп. 81. Д. 989. Л.11-16.
6. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). – Ф. 7. Оп. 4. Д. 1797. Л.204-209.
7. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). – Ф. 31. Оп. 6. Д. 759. Л.57-60.
8. Осмоловский М. С. Минск. Градостроительство столицы Советской Белоруссии. Минск, 1952.
9. *Парсаданов, Г. А. Кудинов М. Ф.* О новом Генеральном плане города Минска // БГПИ СООТИ. 1958. № 1.